**Бурдзялёва М.А.,** студ. гр. 414 БДУКМ
Навук. кір. – Гуд П.А.,
кандыдат гістарычных навук, прафесар

# ЭКАЛАГІЧНЫЯ СВЯТЫ

У XXI стагоддзі экалагічны стан планеты стаў глабальнай праблемай сусветнага маштабу. Таму сёння асаблівую важнасць набывае вывучэнне і распаўсюджванне ведаў пра крытычны стан навакольнага асяроддзя з мэтай яго змены і паляпшэння [2, с. 5]. Важна тое, каб чалавек зразумеў важнасць гэтай праблемы і клапаціўся пра экалагічны стан як навакольнага асяроддзя так і свайго здароўя. Трэба ўлічваць важнасць здаровага слоўхарчавання, таму прапаганда здаровага харчавання і страў з якасных прадуктаў павінна знайсці месца і ў святочнай культуры.

Праблема, якая ўздымаецца ў дакладзе, – захаванне экалагічнага стану навакольнага асяроддзя і здаровага ладу жыцця сродкамі святочнай культуры.

Мэта: Павышэнне экалагічнай адукацыі і выхавання, экалагічнай культуры чалавека.

Задачы:

– стварыць класіфікацыю экалагічных свят;

– выявіць структуру свят і арганізацыйныя намаганні па іх увасабленні.

Традыцыі беларускай нацыянальнай культуры з поўным правам могуць быць ацэнены як экафільныя. Перш за ўсё гэта звязана з тым, што беларуская экакультура захоўвае традыцыйныя архетыпы, для якіх характэрны сінтэтычныя трактоўкі адносін чалавека і прыроды [1, с. 5] Экскурс ў гісторыю дазваляе зрабіць вывад аб тым,што у першыя дзесяцігоддзі XX ст. складваецца сістэма сацыякультурнай дзейнасці па развіццю экалагічнай культуры.У канцы 1980 – пачатку 1990 г. на Беларусі актыўна пачалі стварацца дзіцячыя і юнацкія экалагічныя клубы- аб'яднанні [4, с. 5] Работа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтых клубаў паспрыяла ўзнікненню і распаўсюджванню экалагічных свят (экасвят), якія можна класіфікаваць наступным чынам:

- святочныя дзеі агульнаэкалагічнай накіраваннасці;
- фестывалі і святы экалагічнага стану навакольнага асяроддзя і чалавека.

У адпаведнасці з гэтай класіфікацыяй да першай группы адносім:

1. фотаконкурсы, выставы краявідаў краіны, жывёльнага і расліннага свету, напрыклад, фотаконкурс: “Экалогія Беларусі”; прыродна-экалагічныя музеі; эколага-інфармацыйныя цэнтры (Мінск, Гародня, Брэст); 2. Акцыя “Салаўіныя ночы” (выяўленне месцаў пасялення салаўёў па ўсёй Беларусі),фестываль аграэкатурызму «Заборскі фэст» (Расонскі раён Віцебскай вобласці), акцыі назірання за птушкамі (па ўсёй Беларусі) [7, с. 5] 3. Гісторыка-экалагічная экспедыцыя на старадаўніх судах па Нёмане. 4. У лесапаляўнічай гаспадарцы кожнай вобласці ствараюцца экалагічныя маршруты і сцежкі.

Да другой групы экалагічных свят адносім:

1. “Свята леса”. Перспектывамі развіцця гэтага свята можа стаць укараненне ў яго структуру яскравых тэатралізаваных дзей рознатэматычнай накіраванасці, а таксама камерцыйных і гандлевых форм, такіх як бізнес-паляванне, бізнес-рыбалка, бізнес-турызм, аукцыены, латарэі, гандлевыя аттракцыены. У структуру прапануемага свята лесу ўваходзяць рознастайныя выставы, гандль прадуктамі леса, а таксама розныя экалагічныя, пазнавальныя, відовішчныя, спартыўныя, рэкрэатыўныя праграмы [6, с. 5]

2. “Свята птушак ў Тураве”. У структуру ўваходзяць: пляцоўка з тантамарэскамі, майстар-клас па маляванню птушак, памятны буклет АПБ, інтэлектуальныя конкурсы, выступленні фальклорных калектываў з Тураўскіх ваколіц,абарона школамі свайго віда птушкі-жыхара Тураўскага Балоння,прыемныя падарункі усім удзельнікам свята. Цэнтральным момантам першага свята (1 мая 2009 г.) стала адкрыццё скульптуры куліка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

марадункі, які стаў галоўным героем свята і сімвалам адраджэння экалагічнай адметнасці Турава.

3. Фэст “Жураўлі і журавіны мёрскага краю”. У структуру свята уваходзяць: конкурс імправізаваных вясковых падворкаў, наладжана разнастайная выпечка з журавінамі, журавінавы морс, выступленні песенных калектываў і выканаўцаў, конкурсная праграма сярод школьніц "Мёрская Журавінка", атракцыёны, экалагічныя гульні, віктарыны, выстава-продаж вырабаў народных майстроў, арганізаваны аўтобусны выезд на палі Мёрскага краю, дзе праз біноклі можна назіраць за зграямі грацыёзных шэрых жураўлёў.

4. Свята Гусей у в. Белая Дуброва Касцюковіцкага р-на. У структуру уваходзілі: конкурсы «Чый гусь лепш», «Гусіны бег», «Гусіныя лапкі»), дегустацыя страў з гуся, аукцыён гусей, выступленні удзельнікаў мастацкіх калектываў, святочны гандль.

5. “Свята кветак ў Шчучыне”. Структура свята: конкурс кветкавых кампазіцый, конкурс падворкаў, самых працавітых і творчых гаспадароў ушаноўваюць прызамі, ладзяць выставы кветак і дэкаратыўных раслін, выставы прадукцыі шчучынскіх пчаляроў і гасцей з іншых раёнаў. З 2004 года свята кветак праходзіць з удзелам спецыялістаў Цэнтральнага батанічнага сада Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

Беларускі кірмаш можна аднесці да святочных з’яў экалагічнай накіраванасці.Сёння на Беларусі праводзяць разнастайныя кірмашы:рыбныя кірмашы (у Мінску, Гародне, Віцебску, Вілейке і інш.); мясныя кірмашы (у Бабруйску, Оршы, Нясвіжы,Мінску); ягадныя кірмашы (у Глыбокім, Століне,Шчучыне) грыбныя кірмашы (у Дрэтуні, Глыбокім).

6. «Мотальскія прысмакі» – фестываль кулінарных традыцый Палесся і народных рамёстваў. Мэта фестывалю – экалогія здаровага харчавання, аднаўленне і папулярызацыя рэгіянальных культурна-бытавых традыцый. Структура свята: конкурс падворкаў,святочны гандль прадуктамі мясцовых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вырабнікоў і гасцей фестываля, на трох пляцоўках выступленні народных калектываў, атракцыёны, гульнёвыя пляцоўкі.

7. У горадзе Шклове Магілёўскай вобласці нарадзілася новае свята – свята агурка (2007 год), праводзіцца кожны год. Горад ужо даўно замацаваў за сабой статус “агурочнай сталіцы”. У структуру свята ўваходзяць:майстар-клас па вырошчванню агуркоў, кансервацыі і прыгатавання з агуркоў розных смачных страваў, дэгустацыя, гандлёвыя рады і канцэртныя пляцоўкі.

8. Зусім новай з’явай экалагічнай культуры Беларусі стаў фестываль вішань. У горадзе Глыбокае Віцебскай вобласці праводзіцца першы ў Беларусі Вішнёвы фестываль. Гэта унікальная з’ява для Беларусі садзейнічае выпрацоўцы брэнда, які можа стаць адной з візітных картак краіны і, што не мала важна,паспрыяе прытоку турыстаў. Свята распачынаецца вішнёвым шэсцем і выбарам вішнёвай каралевы. Затым адбываюцца: тэатральны форум «Вішнёвы сад», змаганне кулінараў, фотаконкурс, конкурсы ландшафтных кампазіцый, ікебаны, сувеніраў, цырульніцкага мастацтва, песень, гумарыстычныя конкурсы на хуткаснае паяданне вішань, па стральбе костачкамі, пленэрных мастакоў, міжнародная кірмаш, плануецца закласці вішнёвы сад.З праектам «Вішнёвы фэст» Глыбоцкі райвыканкам удзельнічаў у III міжнародным форуме “Імідж Рэспублікі Беларусь: час дзейнічаць”, і заняў у ім другое месца.

9. “Грыбны фестываль” Вёска Дрэтунь на Віцебшчыне стала радзімай першага грыбнога фестывалю. Грыбны чэмпіянат стаў адной з візітных картак рэгіёну, які дапамагае прыцягнуць шырокую публіку і стварыць свята для саміх вяскоўцаў.Структура свята:прэзентацыя лекавых траў і вырабаў з прыроднага матэрыялу, а таксама «дрэтуньскія прысмакі» – стравы нацыянальнай кухні, выступленні калектываў, гандль,гульнёвыя пляцоўкі.

Такім чынам, экалагічнае выхаванне чалавека- гэта арганізаваны, планамерны і сістэматычны працэсс засваення экалагічных ведаў рознымі сродкамі у тым ліку і сродкамі з’яў святочнай культуры [3, с. 5]. Экалагічная культура-вышэйшая стадыя экалагізацыі разумення чалавека. Зараз ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусіі назіраецца працэс нараджэння і развіцця святочных з’яў экалагічнага накірунку, ствараюцца і адраджаюцца кірмашы па продажу экалагічна чыстых тавараў, прадуктаў харчавання. Таму менавіта сфера святочнай культуры павінна стаць адным з аб’ектаў стварэння, адраджэння і дальнейшага развіцця экалагічнага захавання як чалавека так і навакolля.

---


1. Самерсава, Н.В. Развіццё грамадскага экалагічнага руху ў сістэме СКД / Н.В. Самерсава // Культура ва ўмовах глабалізацыі. – 2009. – № 1. – С. 40–43.

2. Маркаў, Ю.Г. Сацыяльная экалогія / Ю.Г. Маркаў. – Новасібірск : Навука, 1986. – 98 с.

3. Нікалайкін, Н.І. Экалогія : падручнік для ВНУ / Н.І. Нікалайкін. – Масква : Вышэйшая школа, 2003. – 598 с.

4. Мажэйка, М.А. Беларуская экалагічная культура ў прасторы дыялога заходніх і ўсходніх традыцый / М.А. Мажэйка // Сацыяльна педагагічная работа. –2008. – № 7. – С. 4.

5. Каляндар BY [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.calendar.by/day.php?date=15-09-2013. – Дата доступу : 13.03.14.

6. Праграма развіцця ААН (ПРААН) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://undp.by/undp/news/belarus/02-10-2012-n1.html. – Дата доступу : 12.03.14.

7. Бібліятэка і экалогія [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://old.nlb.by/press/upload/1305.pdf. – Дата доступу : 11.03.14.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ